Сьвятлана Калядка



...Чалавеку цяжка перарабіцца адразу.
Можна думаць і гаварыць іначай.
А сам чалавек доўга будзе ранейшым...

# «На падмурку зьнітаваных імпрэсій..»

Жанчына за кубачкам кавы. Здаецца, што пах гэтай кавы, быццам кальян, туманіць сьвядомасьць і распаўсюджвае ў паветры прыгожыя малюнкі, жывыя, пластычныя і нерухомыя, быццам зьмярцьвелыя; шматколерныя і чорна-белыя... Менавіта так уяўляеш лірычную гераіню Аксаны Данільчык у новым паэтычным зборніку "IL MEZZOGIORNO: Поўдзень" (2006). Яе гераіні, быццам і самой паэтцы, застаецца толькі зафіксаваць гэтыя малюнкі ў слове, пасьпець "злавіць" хуткаплыннасьць імгненьня, ажывіць мастацкімі сродкамі гатычныя гмахі жывых і мройных уяўленьняў. Так, менавіта гатычны стыль ("готыка – стыль сярэдневяковай заходнееўрапейскай архітэктуры, які характарызуецца лёгкасьцю канцовых збудаваньняў стральчатага скляпеньня, багацьцем рознакаляровага шкла і скульптурных арнаментаў") характарызуе творчую манеру Аксаны Данільчык у стварэньні верша. Безумоўна, ёй дадзена лёгкасьць у "будаўніцтве" твору; мудрагелістыя арнаменты (стылістычныя тропы) не абцяжарваюць вытанчаную струк-

туру мастацкай карціны, думка не кладзецца цяжарам у тканіну твору, а ірвецца, нібы востраверхія шпілі, у бязмежную прастору.

Партовага горада шпілі імклівыя.
Забыцца на ўсё – на журбу, на дакоры.
Мы будзем шчасьлівыя, вельмі шчасьлівыя.
Мы ведаем шлях да Паўночнага мора.
*("***Да споведзі страты і ціхай пакоры...", С.32)*

Рэдкія вершы маюць зачыненую, завершаную будову, большасьць уздымаецца да высокіх узроўняў экзістэнцыйнай шматварыянтнасьці быцьця. Немагчыма стракатасьць жыцьця ўкласьці ў імпрэсію (дарэчы, Л.Галубовіч у рэцэнзіі на зборнік Аксаны Данільчык разглядаў творчасьць паэтэсы праз прызму імпрэсіянісцкага стылю, і ў гэтым з крытыкам можна пагадзіцца, аднак нельга толькі гэтым абмяжоўвацца), нават калі яна дазваляе аўтару адштурхоўвацца ад непасрэднай перадачы суб'ектыўных адчуваньняў, мімалётных уражаньняў і настрояў і ў гэтым цалкам, ва ўсёй паўнаце, перадаваць мудрагелістыя перапляценьні думкі, эмоцыі і перажываньня. Імпрэсія – гэта як увасабленьне карціны жыцьця ў межах зрокавай прасторы, прасякнутай пэўнай думкай. І многія падобныя імпрэсіяністычныя замалеўкі Аксанай Данільчык ствараюцца, здаецца, на адзіным узьлёце натхненьня, на гранічным напале пачуцьця, на дзявятым вале эмацыйнага ўзрушэньня. І нават спакойную, ціхамірную плынь часу ў творах прасякае, нібы рэнтген, думка: табе дадзена шчасьлівая нагода жыць у гэтым сьвеце, сузіраць яго і праз сузіраньне яшчэ глыбей спасьцігаць самую сябе.

Ля ног раптоўна апынуўся цэлы сьвет –
Пластычных вулачак лагоднае маўчаньне,
Расьлін пакорлівых гарачае дыханьне,
Званіц далёкіх дасканалы сілуэт.

У неабсяжнасьці прасторавых шляхоў
Не існуе ніякіх вымярэньняў,
І птушкі цень затрыманым імгненьнем
Апусьціцца на вечнасьць камянеў...
*("Cortona", С.33)*

Гераіні Аксаны Данільчык дадзена бачыць сьвет у суразьмернасьці частак, у гармоніі зьяваў і прадметаў. Гармонія паўстае ня толькі ўвасабленьнем прыгажосьці акаляючага сьвету, ня толькі адчуваньнем дасканаласьці прыродных дароў, але і пошукам пунктаў судакрананьня космасу душы чалавека і сусьвету. Гатычны стыль становіцца зьместам сьветаўспрыняцьця, структурай паэтычнай пабудовы твору. Можна нават гаварыць пра "гатычную сьвядомасьць" Аксаны Данільчык у спосабах стварэньня імпрэсіяністычнага вершу. У выкананьні А.Данільчык гэты стыль набывае свае адметныя рысы: бязважкасьць і лёгкасьць, здавалася б, "шматпавярхоўных" паэтычных малюнкаў (сустракаюцца і абцяжараныя напластаваньнем карцінаў вершы, як у "Rocca Paolina", аднак гэта адбываецца, хутчэй, з-за даніны арнаменталізму, з-за "ўціску" італьянскай культуры з яе сьпецыфікай сьветабачаньня, і такіх вершаў няшмат); як гаворыць сама паэтэса, "лагоднасьць рухаў" і "ашчаднасьць слова" ("***І ўзыдзе прыгажосьць..."), дзёрзкі рух прамых лініяў у прасьцяг, стрыманасьць інтанацыяў з іх дыялектычнымі ўзаемапераходамі, і вытанчаная простасьць вершаванай канструкцыі. За ўсім гэтым знаходзіцца "перспектыва" як шлях разьвіцьця творчай індывідуальнасьці Аксаны Данільчык. "Перспектыва" руху думкі, перажываньня, эмоцыі, пачуцьця, "перспектыва" ў дынаміцы дыялогу паміж аўтарам і чытачом; "перспектыва" ў выхадзе на экзістэнцыйны ўзровень самаасэнсаваньня. Калі быць дакладнай, гэта тэндэнцыя акрэсьлілася яшчэ ў

першым паэтычным зборніку “Абрыс Скарпіёну”, аднак ад “скарпіёнаўскай” сутнасьці Аксаны-студэнткі тут мала што засталося, хіба што зададзенасьць “гатычнага” стылю ў стварэньні тэксту, вельмі добрая філалагічная падрыхтаванасьць, філіграннае паэтычнае майстэрства ў апрацоўцы слова. У сёньняшняй Аксаны Данільчык філалагічныя экзэрсісы насычаны інтэлектуальна-філасофскімі пошукамі сэнсу быцьця. У гэтым ёй дапамогай выступае даўняя цікавасьць да сусьветнай культуры і літаратуры (асабліва – італьянскай), і часам яе гераіня ўспрымаецца адною з інтэлектуалак, якая змагаецца “за свае ўласныя стварэньні, вольнасьць выбару сваёй асобы” (“***Тонкім пальцам водзячы па шкле…”). Аднак рытарычных пытаньняў, выказаных у паветра, і глыбокадумных развагаў у зборніку мы не сустрэнем. Для гераіні Данільчык пошукі сэнсу часта зводзяцца да знойдзенага “кансэнсусу” – паміж явай і ірэальнасьцю, зьместам і формай, сутнасьцю і яе тлумачэньнем…

Секс для адных паратунак,
А для другіх пачастунак.
Ні першыя, ні другія ня зьведалі сэнсу.
Секс ня можа быць мэтай.
Толькі спасьцігнуўшы гэта,
Можна знайсьці кансэнсус.
*(“Імправізацыя на зададзеную тэму”, С.24).*

Увогуле, усё часьцей сучасная паэзія пачынае гаварыць на мове жанчын-інтэлектуалак (напрыклад, творчасць Г.Булыкі, І.Багдановіч, Л.Рублеўскай і інш.). Так і ў Аксаны Данільчык, каб правільна зразумець сэнс некаторых вершаў, трэба быць філалагічна падрыхтаваным (толькі праз прызму веданьня старажытных міфаў і мастацтва маньерыстаў асэнсоўваецца верш “***Мой недавер з цынізмам на мяжы…”). Інтэлектуалізм у “жаночай” паэзіі, як мне здаецца, акрэсьліўся не з жаданьня канкурыраваць з “мужчынскай” паэзіяй і даказваць сваё правамоцтва на роўнасьць пазіцыяў у літаратуры, а ўзьняўся на важных працэсах у сацыяльным жыцьці грамадства, прадыктаваных у першую чаргу зьменамі парадыгмаў сьвядомасьці. Своеасаблівасьць асучасьненага падыходу Аксаны Данільчык да падзеяў у “сьвеце і душы” праяўляецца таксама ў індэтэрмінаванай сутнасьці яе лірычнай гераіні, якая раскрываецца праз дамінацыю жаночага, родавага ў акрэсьліваньні персьпектываў як сацыяльнага росту, так і душэўных працэсаў. Дастаткова прачытаць адзін верш “***адчуваючы сьпінаю падлогу…”, каб уявіць зьмену роляў нават у інтымных дачыненьнях, калі жанчына ўладарыць ня толькі ў ролі маці, а і ў ролі “Я-кахаю-цябе”:

адчуваючы сьпінаю падлогу
якую павольна штурхае зямля
і фіксуючы пагляд на рэльефах столі
я жадаю толькі аднаго
прайсьці праз цябе
быццам радыёактыўны прамень
сатрасаючы ўсе храмасомы
а калі нарэшце атрымаецца
новы чалавек
кахаць яго так як кахаюць мару

Акт каханьня як акт нараджэньня новага чалавека ў каханым: гэта ўспрымаецца ўразрэз з традыцыйнай фальклорнай і мастацкай практыкай фарміраваньня дачыненьняў паміж мужчынам і жанчынай, калі мужчынскі фалацэнтрычны пачатак пераважаў ва ўсіх сферах жыцьця, а мужчынскае семя стварала жаночую сутнасьць, напаўняла яе сэнсам і зьместам. Моц феміннага

пачатку ў лірычнай гераіні вызначаецца пераносам родавай функцыі з дзяцей на мужчыну: атрымліваючы, жанчына “перапрацоўвае” набытае згодна з уласнымі ўяўленьнямі пра шчасьце і вопытам стратаў і набыткаў і вяртае ўзмоцненую фемініннасьцю і глыбокім пачуцьцём энергетыку душы і цела каханаму, пад узьдзеяньнем якой ён набывае матэрыялізаваны воблік мары. Жаночае атрымлівае кіроўныя функцыі ня толькі ў каханьні, але і ў зьмене псіхалагічна-генетычнага коду мужчынскай сутнасьці. Аднак такая актыўнасьць жаночага “эга” лірычнай гераіні ня зводзіцца да праяваў фемінізму. Яна не адмаўляецца ад традыцыяў роду ў пабудове ўласнага лёсу, яе сутнасьць прасьвечваецца моцным мацярынскім пачаткам, як рэнтгенам, што адлюстравана ў вялікай колькасьці вершаў, прысьвечаных “услухоўваньню” паэтэсы ў перажываньні мацярынскай душы (“***Аніякіх адчуваньняў…”, “***кожны тыдзень – прыступка…”, “***выплываюць з віроў глыбокіх…”, “***Ноч зьвініць над нашай хаткай…”).

Бог ахоўвае крокі жанчын
якія ведаюць
што ў іх народзяцца дзеці
*(“кожны тыдзень – прыступка…”, С.56)*

Сувязь маці з дзіцём заўсёды адбывалася з боскай волі, як гаворыць паэтэса “Сьвет – ад Бога і да Бога”. Праз цяжарнасьць яе лірычная гераіня “жыве ў зачараваньні // Гарманічнасьцю прасторы”. Дзіця становіцца тым цэнтрам сусьвету, праз які адбываецца гарманізацыя прасторава-часавых вымярэньняў. Менавіта дзеці ўтвараюць хранатоп жыцьця жанчыны, а разам з гэтым і ўзвышаюць жанчыну да вобразу Мадонны.

І глядзіць спагадліва Мадонна
На пакуты вечныя жанчын…
*(“***Так абачліва і далікатна…”, С.60)*

Сінхранізацыя абагуленага вобразнага выяўленьня Мадонны ў гісторыі культуры і суб’ектыўнасьці сучаснай жанчыны ў беларускай паэзіі – у гендэрнай прадвызначанасьці “пакутнага” шчасьця. Вечнасьць аб’ядноўвае жаночыя лёсы ў пакутах самасьцьвярджэньня, у пакутах нараджэньня дзяцей. Нават у такім рамантызавана-“дзіцячым” вершы “***Калі мы вярталіся з дзіцячага садка…” паўстае праблема “месца жанчыны на небе”, якая вырастае не з антрапалагічнай абмежаванасьці яе зямнога існаваньня, а з міфалагізацыі ролі Маці, якая распаўсюджваецца на ўвесь сусьвет, у тым ліку і на зорнае неба. Мадыфікацыя вобразаў Жанчыны, Маці адбываецца ў творчасьці Аксаны Данільчык на грунце класічных традыцыяў беларускай літаратуры. Яе таленту (а тое, што перад намі таленавітая паэтэса – не выклікае сумненьняў) дадзена гарманізаваць у творы розныя культурныя прасторы і надаць твору суплетыўную цэласнасьць, якая прасьвечваецца лепшымі традыцыямі беларускай літаратуры.

Можна паспрачацца з думкамі Л. Галубовіча наконт персьпектываў разьвіцьця творчай індывідуальнасьці Аксаны Данільчык, які сьцьвярджаў, што “ад яе будзем чакаць ня толькі заспакоеных, няхай падчас і ўражлівых, сузіраньняў нашага сьвету скрозь прызму пачуцьцёвых перажываньняў яе ўласнага жыцьця, але і яркіх драматычных мастацкіх адкрыцьцяў…”. Ня можа праявіцца драматычная зададзенасьць у асэнсаваньні сьвету і асобы без яе першапачатковай прадвызначанасьці ў паэтычнай сьвядомасьці аўтара. Сумныя настроі (адзін з разьдзелаў кнігі так і называецца “Сумная мелодыя 2002”), песімістычныя рэфлексіі ня могуць стаць грунтам да ўзьнікненьня

драматызаванай рэальнасьці паэтычнага твору. А таму дамінацыя прасьветлена-чыстага, “інтэлектуальна-імпрэсіяністычнага” погляду на акаляючы сьвет дасьць нямала падставаў да стварэньня тэкстаў, у якіх будзе валадарыць аптымістычная недасягальная гармонія сьвету, да якой усё жыцьцё імкнецца зямны чалавек. У эпіграфы з Ж-П.Сартра, з якога пачынаецца трэці разьдзел “Сумная мелодыя 2002”, вызначана таксама і пазіцыя Аксаны Данільчык да ўласнай творчасьці: “…жыў на сьвеце бедалага, які выпадкова патрапіў ня ў той сьвет. Ён існаваў, як іншыя людзі, сярод гарадскіх паркаў, бістро, гандлёвых цэнтраў, але хацеў пераканаць сябе, быццам жыве недзе па той бок жывапісных палотнаў з дожамі Цінтарэта і адважнымі фларэнційцамі Гацолі…”. Увогуле структура кнігі, якая складаецца з чатырох разьдзелаў, адлюстроўвае шляхі разьвіцьця думкі і перажываньня паэтэсы: ад “авалодваньня” сэнсам жыцьця да яго смакаваньня ва ўсіх нечаканых пералівах і несумяшчальных палітрах, што ўвасобілася ў вобразе “гранатавага соку”.

А.Пашкевіч адзначае: “Свайго росквіту дасягае і яшчэ адзін ідэйна-тэматычны магістрал сучаснай беларускай літаратуры – літаратура эстэтызму. Апяваньню ідэалаў прыгожага, гарманічнага і ўзьнёслага прысьвячаюць свае творы Р.Барадулін, У.Някляеў, Л.Дранько-Майсюк, Н.Мацяш, М.Скобла, Э.Акулін, А.Камоцкі, А.Бадак, А.Данільчык і сотні іншых у паэзіі”. Месца Аксаны Данільчык акрэсьлена сярод ужо добра вядомых імёнаў беларускай літаратуры і нездарма: яе творы сьведчаць пра самыя высокія эстэтычныя якасьці паэтычнага майстэрства, пра дэтэрмінацыю ідэалаў прыгожага ў пабудове твору, пра мастацкае ўзвышэньне будзённага да вышыняў міфілагізавана азначанага прыкметамі абсалютнай гармоніі.